**Вашкевіч, А.** Пад свінцовым агнём / А. Вашкевіч // Лепельскі край. — 2002. — 2 крас. — С. 3.

# ПАД СВІНЦОВЫМ АГНЁМ

Свой расказ Сяргей пачаў з верша: «Лиловеет шапка тумана на вершине твоей, Чунгар, и всё время кажется сердцу, что земной расколется шар».

– Свае?

– Не. Гэта афганскі паэт Сулейман Ланк. «Песня Чунгара» называецца. Захавалася ў памяці. У тых мясцінах давялося пабываць.

У жыцці Сяргея Мікалаевіча Крывяля Афганістан пакінуў балючую адмеціну на сэрцы...

Нарадзіўся Сяргей у Слабодцы. Скончыў сем класаў Старалядненскай школы, потым тэхнікум. Працаваў на Цаліне. Прызвалі ў армію. Пасля застаўся на звыштэрміновай службе ў Бароўцы.

У той час ужо ішла вайна ў Афганістане. Трапіў у тое гарачае пекла і прапаршчык Сяргей Крывель.

Агнявому ўзводу, якім камандаваў С. Крывель, выпаў, бадай, самы гарачы ўчастак дарогі – Кушка – Шындарт – Кабул. Ля самай граніцы з Іранам. Гэта ў глыбінцы. Узвод размяшчаўся на дзевяці «кропках» уздоўж «дарогі жыцця».

83-і год. Кастрычнік. Калона ці не з дваццаці «паліўнікаў» пасля непрацяглага прыпынку, пачала рух. Нечакана пачуліся выстралы з гранатамётаў. Духі падбілі першую і шостую машыны з палівам. Потым адкрылі агонь з аўтаматычнай зброі. Дарога ўспыхнула суцэльным агнём. Савецкія воіны не разгубіліся, уступілі ў бой.

Аднак сілы былі няроўныя. С. Крывель выклікаў падмацаванне з суседняй «кропкі». Атаку душманаў адбілі.

А гэты эпізод запомніўся тым, што адбыўся перад Новым годам. Духі, мусіць, разлічвалі, што шуралі паслабяць увагу...

– Мы заўважылі духаў, – прыгадвае Сяргей, – з аддзяленнем салдат зайшлі ім у тыл, атакавалі...

Баявыя сутычкі паўтараліся. Гінулі воіны. Аднак сярод сваіх падначаленых я не памятаю выпадку праяўлення баязлівасці. Усе дзейнічалі смела, рашуча.

– Сяргей, кажуць, ты, быў паранены...

Так, падарваўся на міне. Потым было працяглае лячэнне ў шпіталях у Кушцы, Маскве. Урачы паставілі на ногі.

– Ты лічышся інвалідам. Адчуваеш аб сабе клопат з боку ўлады?

– Не скарджуся. Па льготах я прыроўнены да ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Спачатку меў «Запарожац», цяпер езджу на аўтамабілі «Ака». Маю ўпарадкаваную кватэру, сям’ю. Атрымліваю пенсію па інваліднасці і працую ў «Ахове».

– Якія маеш узнагароды?

– Медаль «За баявыя заслугі», некалькі ўрадавых узнагарод Афганістана. – У Афган не цягне, так сказаць, прайсціся па былых гарачых слядах?

– Няхай абмінае нас вайна і ўсялякія канфлікты ў «гарачых кропках». А вось як турыст наведаўся б. Памяць аб Афгане засталася на ўсе жыццё.

**А. Вашкевіч**